УДК 322 (476.6)

# ЛІКВІДАЦЫЯ ГРОДЗЕНСКАГА ДАМІНІКАНСКАГА КЛЯШТАРА Ў КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ЗМЕН НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў 30-Я ГГ. XIX СТ.

**А.Р. Радзюк**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»

**г. Гродна, Рэспубліка Беларусь**

В данной статье рассматриваются особенности царской политики на Гродненщине в 30–е годы XIX в. Основные проявления этих изменений, затронувшие многие сферы общественной жизни, отчетливо проявляются в деле ликвидации гродненского доминиканского монастыря.

This article deals with the problem of tsarism policy at Grodno region in 30-th years of the XIXth century. The changes of government plans of actions are revealed with the help of the example concerning liquidation of Grodno Dominican monastery in 1833.

Скасаванне кляштара дамініканцаў у Гродна адбылося ў 1833 г. У адрозненні ад большасці рэлігійных установаў падобнага тыпу, што былі зачынены царызмам на пачатку 30-х гадоў XIX ст., асноўная прычына яго ліквідацыі знаходзіцца ў палітычнай сферы. У гэтым годзе на Гродзеншчыне ўладамі была выкрыта разгалінаваная канспературная сетка на чале з эмісарамі, якія перабраліся з Францыі на землі былога ВКЛ з мэтай падрыхтоўкі новага нацыянальна-вызваленчага паўстання. Узначальваў гэтую экспедыцыю Ю. Заліўскі. Таму ўсе яе ўдзельнікі і завербаваныя прыхільнікі атрымалі назву "заліўчыкаў". Асобай, што адказвала за ўзняцце новай хвалі ўзброенай барацьбы ў ваколіцах Гродна быў ураджэнец гэтага горада М. Шыманскі. Менавіта яго дзейнасць дала падставу царскай адміністрацыі да ліквідацыі гродзенскага кляштара дамініканцаў.

Пасля выкрыцця кансператыўнай сеткі "заліўшчыкаў" у Гродзенскім уездзе і самім губернскім горадзе, улады выявілі дачыненне да гэтай справы некаторых настаўнікаў айцоў-дамініканаў, а таксама вучняў гімназіі, што існавала пры азначаным кляштары. Асноўныя абвінавачанні былі высунуты супраць прыёра Міхала Зялёнкі (айцец Кандыд), які выконваў функцыю прэфекта (дырэктара) гімназіі. Дарэчы, ён жа з'яўляўся першым бібліятэкарам гродзенскай публічнай бібліятэкі, створанай за два гады да гэтых падзей. Нягледзячы на тое, што падчас следства быў пацверджаны факт адмовы М. Зялёнкі дзейнічаць сумесна з эмісарам М. Шыманскім, прыёр быў узорна пакараны. Улады пастанавілі выслаць яго ў адну з аддаленых губерняў пад пільны паліцэйскі нагляд [1, а. 65]. У якасці месца ссылкі была абрана Арэнбургская губерня. Дарэчы, ксёндз М. Зялёнка сваёй дзейнасцю пакінуў значны след у сібірскім выгнанні.

Там ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам як у афіцыйных улад, так і каталіцкай дыяспры. Акрамя сваёй асноўнай пастарскай дзейнасці, ён таксама займаўся працай па вывучэнні краю, у якім ён апынуўся супраць сваёй волі. Так, у Арэнбургу ён пераняў і ўзначаліў музей, што быў заснаваны Т. Занам. Пры яго асабістым ўдзеле працягваліся папаўняцца музейныя калекцыі [2, s. 717]. Вось такім чынам гродзенскія дамінікане ўнеслі свой уклад у вывучэнне Сібіры.

Следству, што вялося па справе М. Шыманскага ў Гродна, удалося ўстанавіць факт, што "крамола" глыбока пранікла ў сцены дамініканскай школы. 25 мая 1833 г. па абвінавачанні "ў зламысны намерах" былі арыштаваны два манахі-настаўнікі. Але, што яшчэ больш напалохала ўлады, быў факт выкрыцця "злачынных намераў" у вучнёўскім асяроддзі. Больш за тое, ніці змовы прывялі нават у прыватны пансіён для дзяўчынак: за краты быў кінуты яго ўтрымальнік Фіжан. Усе гэтыя падзеі перадвырашылі далейшы лёс як самога кляштара, так і вучэльні пры ім.

Тут трэба адзначыць, што ўсе ўзгаданыя падзеі адбываліся як раз у той час, калі царызм павёў шырокамаштабны наступ на ўсе тыпы навучальных устаноў, што знаходзіліся ў руках каталіцкага духавенства. Як сведчаць матэрыялы справы, на падставе якой у асноўным напісаны гэты артыкул, да 1833 г. на тэрыторыі Гродзенскай губерні былі ўжо зачынены 3 уездныя вучылішчы (базыльянскае ў Жыровічах – 1828 г., дамініканскае ў Навагрудку – 1832 г., піярскае ў Шчучыне – 1832 г.) і 7 прыходскіх вучылішчаў (Брэст, Зэльва, Дзярэчын, Буховічы, Пружаны, Шарашова, Бяроза), якія належылі розным манаскім законам [1, а. 16]. Замест іх улады адчынялі адпаведныя навучальныя ўстановы, на падставе агульнарасійскіх адукацыйных правіл. Разам з тым, на той час, яшчэ не ўсе вучэбныя ўстановы, што існавалі пры кляштарах напаткаў падобны лёс. Працягвалі сваю дзейнасць уездныя вучылішчы пад апекай каталіцкіх ордэнаў у Лідзе, Лыскаве, Слоніме, а таксама 14 прыходскіх вучылішчаў у розных мясцовасцях губерні. На той час агульная колькасць вучняў у іх складала 288 чалавек (у сярэднім па 20 вучняў на вучэльню) [1, а. 18].

Пытанне аб будучым гродзенскай дамініканскай гімназіі вырашалася ў сталіцы на самым высокім узроўні. Але ключавую ролю ў вызначэнні яе лёсу адыграла пазіцыя, якую заняў па гэтым прадмеце мясцовы губернатар М. Мураўёў. Як сведчыў віленскі генерал-губернатар кн. Далгарукаў, імператар уласнаручна звярнуўся да яго каб: "запытаць, ці не лічу я за лепшае зачыніць гімназію і пансіён" ) [1, а. 23]. Паколькі ў Вільні на той час яшчэ не валодалі ўсёй інфармацыяй

па гэтым пытанні, генерал-губернатар, у сваю чаргу, фактычна, усклаў адказнасць за прынясце рашэння на М. Мураўёва. Аб тым, якую пазіцыю заняў апошні ў адносінах да дамініканскай навучальнай установы сведчыць чарговы ліст кн. Далгарукава: "разгледзеўшы Ваша прадстаўленне ад 10 ліпеня 1833 г., я выявіў, што, сапраўды, гродзенскі кляштар дамініканцаў і вучэбная ўстанова пры ім не павінны існаваць…" [1, а. 66]. Далей генерал-губернатар паведамляў, што Мікалай I пагадзіўся з яго прапановай скасаваць азначаны кляштар і духоўнае вучылішча пры ім для пераўтварэння апошняга у свецкую гімназію з шляхетным (благородным) пансіёнам і ўезднае вучылішча з школай узаемнага навучання.

Але адкрыццё азначаных устаноў адбылося не так хутка, як планавалася. Працэс зацягнуўся на некалькі гадоў. Справаводства ўладаў па гэтым пытанні як у люстэрку адлюстроўвае асноўныя праявы тагачаснай палітыкі царызму ў культурнай, палітычнай, сацыяльнай, рэлігійнай і іншых сферах.

Першапачатковая затрымка тэрмінаў адкрыцця губернскай гімназіі звязана з палітычнай сферай. Адразу ж пасля скасавання кляштара і высялення манахаў і вучняў, падамініканскі будынак быў выкарыстаны ўладамі пад турму. У 1833 г. ён быў прыстасаваны пад вязніцу для ўдзельнікаў экспедыцыі Заліўскага і тых, хто прымаў і аказваў ім дапамогу на месцы. Толькі на ўстаноўку кратаў у гэтым будынку ўлады ахвяравалі 432 рублі [3, а. 21]. У лютым 1834 г. усе вязні з дамініканскага былі пераведзены ў былы кармеліцкі будынак.

Падрыхтоўка да адкрыцця новай навучальнай установы вялася грунтоўна. З мэтай вывучэння патэнцыяльнага кантынгента вучняў губернскай гімназіі, улады ладзілі сацыяльны маніторынг, які выявіў значнае скарачэнне колькасці верагодных навучэнцаў. Гэты працэс быў звязаны з палітыкай царызму, накіраванай на скарачэнне лічбы прывілеяванага стану ў сувязі з рэалізацыяй праграмы па разборы шляхты. Дадзеныя, што былі зафіксаваны афіцыйнай статыстыкай сведчаць, што па стану на 1-га студзеня 1833 г. (праз год і два месяцы пасля з'яўлення адпаведнага царскага указа) колькасць шляхты ў губерні скарацілася на 1/3 – з 21350 чалавек мужчынскага полу да 14293 [1, а. 29, 30, 60]. Рэшта ўжо на той час была далучана да падатных саслоўяў аднадворцаў і грамадзян. На думку ўладаў, толькі адзінкі (найлепшыя і найбольш годныя) з гэтых станаў маглі б навучацца ў гімназіі. Для астатніх прызначаліся вучылішчы [1, а. 60].

Адначасова з сацыяльнымі вырашаліся і матэрыяльныя пытанні як старой, так і новай навучальнай установы. Гэтыя два працэсы былі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Ад былой гімназіі на карысць новай

перайшоў будынак, фізічны, механічны, мінералагічны кабінеты, частка гаспадарчых рэчаў. Іншую частку апошніх улады па заведзенай на той час практыцы прадалі з аўкцыёна. Асобна хацелася б спыніцца на лёсе кнігазбору гродзенскіх дамініканцаў. На той час ён налічваў 10249 і каля 500 "дуплікатных" выданняў. У іх пераліку сустракаюцца рукапісныя творы першай паловы XV ст., інкунабулы, але пераважная колькасць старадрукаў датаваныя XVI ст. [1, а. 808–812]. У адрозненні ад большасці іншых падобных пакляшторных бібліятэк, яна не была расцярушана, але цалкам перададзена на патрэбы новай гімназіі.

Інакш вырашалася пытанне з пакляшторным фундушом. На той час ён складаў 41 тыс. рублёў срэбрам (165 сялянскіх душ). Улады пастанавілі далучыць гэтыя грашовыя паступленні да агульнага капіталу каталіцкага духавенства, а на карысць губернскай навучальнай установы асігнаваць такую ж суму з дзяржаўнай казны. [1, а. 106]. Акрамя таго, працэс падрыхтоўкі губернскай гімназіі да яе адкрыцця патрабаваў ад мясцовай адміністрацыі дадатковых выдаткаў. На перабудову мураванага флігеля ў былым дамініканскім кляштары для шляхетнага пансіёна, дабудову да яго драўлянага шпіталя, лазні, амбара, сарая і плота было вызначана ў 1834 г. 41,7 тыс. руб. Пры гэтым адной з умоў на правядзене падрадных работ было тое, каб ўсё будаўнічае смецце (акрамя кратаў) было б выкарастана на подсціл школьнага двара [1, а. 582].

У сувязі з тым, што будынак падамініканскага кляштара пэўны час выкарыстоўваўся ў якасці вязніцы, а таксама з-за зацягвання тэрмінаў рамонта-будаўнічых работ яўрэйскімі падрадчыкамі, тэрміны адкрыцця новай гімназіі адкладваліся. Фактычна, з вясны 1833 па вясну 1834 гг. г. Гродна заставаўся без сваёй асноўнай вучэльні. Падобная сітуацыя не магла не турбаваць як бацькоў навучэнцаў, так і чыноўнікаў беларускай навучальнай акругі. У выніку, каб супакоіць усе бакі, мясцовая адміністрацыя была вымушана арандаваць пад гімназію адмысловы будынак – палац кн. Любецкага па адрасу: Магістрацкая плошча, 13. Навучэнне там распачалося 5 красавіка 1833 г., аб чым неаднаразова паведамлялі абвесткі па ўсім горадзе [1, а. 540]. Адначасова пры гімназіі была адчынена ланкастарская школа. Акрамя таго, у планах уладаў было стварэнне шляхетнага пансіёна пры асноўнай вучэльні з мэтай падрыхтоўкі вучняў да паступлення ва ўніверсітэты [1, а. 303]. Пры гэтым з іх ліку 10 вучняў павінны былі навучацца за кошт казны. Ліставанне ўладаў па гэтым пытанні сведчыць, што перанос азначаных вучэльняў на іх сталае месца ў падамініканскі кляштар адбылося толькі праз два гады – 1 жніўня 1836

г., а ўрачыстае адкрыццё яшчэ пазней – 30 жніўня таго ж года [4, а. 147].

Канечне ж, змены ў сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі пачатку 30-х гадоў XIX ст. як у г. Гродна, так і на беларускіх землях у цэлым, мелі больш глыбокі характар, чым проста замена шыльд ці месца размяшчэння той ці іншай навучальнай установы. Сутнасць гэтых пераменаў заключалася ў цалкавітай нівеліроўцы мясцовых адметнасцяў у школьнай справе і ўніфікацыяй з адукацыйнай сістэмай, што існавала ў цэнтральных губернях імперыі. Вынікам гэтага працэсу стала змена праграм і мовы навучання, настаўнікаў і г.д. Што тычыцца апошняга, то зразумела, што старыя педагагічныя кадры айцоў дамініканаў не маглі быць выкарастаны ў новай вучэльні. Педагогі былі часткова запрошаны з свіслацкай і беластоцкай навучальных установў, часткова гэта былі кадры немясцовага паходжання. Педагагічны калектыў гімназіі на самым пачатку яе існавання складаўся з 9 асоб (1 інспектар і 8 настаўнікаў), сярод якіх некаторыя мелі ступень “кандыдата”. Аклад выкладчыкаў складаў 300–400 руб. у год [1, а. 196]. Нажаль, незахаванасць дакументаў, не дае нам магчымасці прасачыць наколькі змяніўся сацыяльны і нацыянальны склад вучняў у новай гімназіі.

Ліквідацыя расійскімі ўладамі гродзенскага дамініканскага кляштара ў 1833 г. было важнай падзеяй у жыцці рэгіёна. Хаця прычыны яго скасавання хаваюцца ў палітычнай сферы, гэтая падзея закранула розныя сферы грамадскага жыцця Гродзеншчыны, у першую чаргу, адукацыйную. Новая школьная сістэма, што стваралася замест старой, павінна была, на думку М. Мураўёва быць “рускай і ў духу самадзяржаўя”. Азначаныя мерапрыемствы царскіх уладаў ажыццяўляліся ў комплексе з іншымі захадамі, асноўнай мэтай якіх з’яўлялася набліжэнне беларускіх зямель да цэнтральных губерняў імперыі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне. Ф. 1, воп. 27, спр. 295.
2. Śliwowska W. Zesłańcy polscy w Imperium Roszjskim w pierwszej połowie XIX wieku. Warszawa. DiG, 1998.
3. НГАБ у Гродне. Ф. 1, воп. 27, спр. 532.
4. НГАБ у Гродне. Ф. 1, воп. 27, спр. 737.